Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 260 (329)
АЎТОРАК 12 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

САМЫ АДКАЗНЫ ЭТАП ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Наступіў самы адказны перыяд выбарчай кампаніі. Акруговыя камісіі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных правялі рэгістрацыю кандыдатаў для балатыроўкі. З вялікім уздымам праходзяць перадвыбарчыя сходы ўпаўнаважаных па акругах, дзе прадстаўнікі фабрык, заводаў, вёсак, устаноў дагаварваюцца аб агульных кандыдатах. На гэтых сходах гучаць палкія словы прамоўцаў, якія дзякуюць партыю і вялікага Сталіна за сваё вызваленне, бяруць на сябе абавязацельствы па датэрміноваму выкананню планаў, акуратнаму выкананню дзяржаўных паставак.

Калектыў 2-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната датэрмінова закончыў кастрычніцкую праграму і такімі-ж высокімі тэмпамі працуе ў лістападзе. Датэрмінова выканаў дзесяцімесячную праграму і калектыў 6-га тэкстыльнага камбіната. Вялікіх поспехаў дабілася плюшавая фабрыка. Саколкаўскі скурзавод да XXIII гадавіны Кастрычніка закончыў гадавую праграму.

Дзесяткі тысяч людзей актыўна ўдзельнічаюць у гэтай выбарчай кампаніі. Па аднаму толькі гораду Беластоку ў выбарчых камісіях занята звыш паўтары тысячы чалавек. Столькі-ж людзей працуе агітатарамі і даверанымі. Яшчэ нядаўна людзі адсталыя, забітыя, якіх польскія паны за людзей не лічылі, становяцца палкімі прамоўцамі і агітатарамі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. На сходзе ўпаўнаважаных Саколкаўскай выбарчай акругі выступіла былая батрачка тав. Зайкоўская. Яе простая ад глыбіні душы прамова выклікала захапляючую авацыю ў зале. Яна заявіла: «Як толькі прыйшла Чырвоная Армія, для нас пачало свяціць сонца. Ёсць яшчэ ў вёсцы і ў горадзе людзі, якія чагосьці чакаюць. Яны прыслухоўваюцца да ўсякай антысовецкай агітацыі. Гэтым людзям я гавару, у свеце няма мацнейшай, чым наша совецкая ўлада. І за гэтую родную ўладу мы будзем стаяць гарой». Сваё выступленне тав. Зайкоўская закончыла словамі: «Дзякуй роднаму Сталіну, які нас вызваліў ад бізуна памешчыкаў, ад бізуна паліцэйскага, ад бізуна асадніка і ад бізуна мужа».

Гэта голас свабоднай совецкай жанчыны. Такіх людзей зараз і ў горадзе, і ў вёсцы дзесяткі тысяч. Гэта людзі, якія пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый будуць каваць перамогу сталінскага блока на прадстаячых выбарах.

Але перамога, вучыць нас таварыш Сталін, сама не прыходзіць, яе звычайна прыцягваюць. Непамерна высокая роля партыйных арганізацый зараз, калі пачынаецца самы адказны этап выбарчай кампаніі— агітацыя за кандыдатаў. Агітацыя за кандыдатаў павінна быць яркая і даходлівая. Не можа быць ні аднаго выбаршчыка, які-б не ведаў біяграфію свайго кандыдата. Трэба дабіцца таго, каб кандыдат у дэпутаты асабіста сустрэўся з найбольшай колькасцю сваіх выбаршчыкаў.

Як ніколі вырастае роля ўсяго нашага большэвіцкага друку, асабліва нізавога. На кожным буйным прадпрыемстве, у кожным калгасе і вёсцы выстаўлены кандыдаты ў сельскі або ў раённы, гарадскі або абласны Советы дэпутатаў працоўных. Насценная газета на прадпрыемстве, ва ўстанове, у калгасе, у школе, у інстытуце мае магчымасць і абавязана расказаць выбаршчыкам аб сваім кандыдаце, змясціць яго фотаздымак, даць выказацца ў насценнай газеце таварышам, якія блізка ведаюць кандыдата па сумеснай рабоце. Партыйныя арганізацыі, прымацаваныя да выбарчых участкаў, павінны дабіцца выпуску насценных газет на сваіх выбарчых участках.

Праводзячы агітацыю за кандыдатаў, нельга ні на мінуту паслабіць раз'ясненне выбарчага закона і тэхніку правядзення саміх выбараў. На жаль, некаторыя партыйныя арганізацыі фармальна адносяцца да сваіх абавязкаў. Партыйныя арганізацыі абласной пракуратуры, абласнога суда і Беластоцкага горкомгаса да гэтага часу не прыступілі да агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў сваіх участкаў.

Трэба ўдзяліць вялікую ўвагу нагляднай агітацыі. Апрача агульных плакатаў і лозунгаў трэба, каб мясцовыя органы ўлады, партыйныя і профсаюзныя арганізацыі забяспечылі выбарчыя ўчасткі нагляднымі дыяграмамі і плакатамі аб дасягненнях за год совецкай улады ў заходніх абласцях. Такія дыяграмы могуць быць у маштабе вобласці, горада і ў маштабе асобных прадпрыемстваў і калгасаў.

Размах цяперашняй выбарчай кампаніі такі, што ён патрабуе пабольш ініцыятывы ад кіраўнікоў пярвічных партыйных і комсамольскіх арганізацый, ад фабзаўмясцкомаў і ўсіх грамадскіх арганізацый. Нельга абмежавацца фармальным вылучэннем агітатараў, трэба паўсядзённа кантраліраваць і аказваць ім дапамогу ў рабоце. Нельга на ўсё адкуль-та патрабаваць сродкі для афармлення і ўпрыгожання ўчасткаў, калі гэта можна зрабіць з унутраных рэсурсаў, матэрыялаў і ўпрыгожанняў, якія маюць у сваім распараджэнні многія нашы партыйныя, профсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі.

Уперадзе больш месяца вялікай адказнай і напружанай работы. Будзем працаваць так, каб забяспечыць новую бліскучую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на прадстаячых выбарах!

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ Ў АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЧЫГУНАЧНАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 7 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет па Чыгуначнай выбарчай акрузе № 7 вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў упраўлення Беластоцкай чыгункі, на якім прысутнічала 475 чалавек, кандыдатуру тав. **Кісялёва Нікалая Васільевіча,** 1903 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1925 года, рабочага, сакратара Беластоцкага абласнога камітэта КП(б)Б.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах кандыдатуру тав. Кісялёва Нікалая Васільевіча ўключыць у выбарчы бюлетэнь па Чыгуначнай выбарчай акрузе № 7.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі А. ЛЕВАРТОЎСКІ.
Намеснік старшыні С. ШЫБКО.
Сакратар В. ФІЛІПОВІЧ.
Члены: С. БУРАС, І. ЮДЭЛЕВІЧ, Н. ЦІМАФЕЕВА.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЛЕНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 1 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет па Ленінскай выбарчай акрузе № 1 вылучаную агульным сходам студэнтаў Беластоцкага педінстытута, на якім прысутнічала 175 чалавек, кандыдатуру тав. **Ферэнцовіча Генрыха Флярэнцінавіча,** 1904 года нараджэння, служачага, беспартыйнага, дацэнта педінстытута.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах кандыдатуру тав. Ферэнцовіча Генрыха Флярэнцінавіча ўключыць у выбарчы бюлетэнь па Ленінскай выбарчай акрузе № 1.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Г. ПЕТРАК.
Сакратар М. БЕЛКІН.
Члены: Н. СІНІК, І. АБРАМОВІЧ, ГОЛЕНСКАЯ.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 5 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 5 вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічнага персанала 6-га тэкстыльнага камбіната, на якім прысутнічала 300 чалавек, кандыдатуру тав. **Курыльскага Ізраіля Хацкелевіча,** 1911 года нараджэння, стаханаўца-двухстаночніка 6-га тэкстыльнага камбіната.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах кандыдатуру тав. Курыльскага Ізраіля Хацкелевіча ўключыць у выбарчы бюлетэнь па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 5.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі І. МЕЖЭВІЧ.
Намеснік старшыні С. СКШЫНЕЦКІ.
Сакратар Ш. ЗІСЛІН.
Члены: З. ДЗЕМЯН, Ф. БАРШЧЭЎСКАЯ, В. ПАПОВА, Б. РАМАНОЎСКІ, М. ФУРМАН, С. МАРОЗАВА.



Агульнагарадскі сход агітатараў горада Беластока, прысвечаны падрыхтоўцы да выбараў у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.
Фота А. Сапіра.

Перадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных чыгуначнай выбарчай акругі № 7

Утульна і прыгожа было ў клубе чыгуначнікаў 10 лістапада. Зала запоўнена прадстаўнікамі рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Беластоцкай чыгункі, 18 і 24 тэкстыльных фабрык, мясакамбіната і іншых прадпрыемстваў.

Нараду адкрывае дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Юхневіч. На павестцы дня — вылучэнне кандыдатуры ў абласны Совет дэпутатаў працоўных. Першым атрымлівае слова прадстаўнік Упраўлення Беластоцкай чыгункі тав. Мацнеў. У сваім выступленні ён сказаў:

— Нікалай Васільевіч Кісялёў з'яўляецца адданым сынам нашай соцыялістычнай радзімы, стойкім большэвіком. На ўсіх участках работы, на якія яго пасылала большэвіцкая партыя, ён з чэсцю выконваў дадзеныя яму даручэнні, паказваючы бязмежную адданасць вялікай справе партыі Леніна — Сталіна. Цяпер ён працуе першым сакратаром Беластоцкага абкома партыі.

15 снежня—у дзень выбараў— мы, выбаршчыкі 7-й выбарчай акругі па выбарах у абласны Совет, прыйдзем да выбарчай урны і аддадзім свае галасы за тав. Кісялёва.

Ад рабочых Беластоцкай чыгункі выступіў тав. Новікаў. Ён горача падтрымаў прапанову тав. Мацнева. Затым выступіў тав. Попарц, які выразіў думку рабочага калектыва 24-й тэкстыльнай фабрыкі аб аднадушным падтрыманні кандыдатуры тав. Кісялёва. Ад рабочага калектыва 18-й тэкстыльнай фабрыкі выступіла тав. Рагоўская.

З прамовай па нарадзе выступіў тав. Кісялёў. Ён расказаў аб вялікіх поспехах гаспадарчага будаўніцтва ў Совецкім Саюзе, аб выдатным росце вядучых галін прамысловасці, аб дасягненнях у гаспадарчым і культурным будаўніцтве ў заходніх абласцях БССР, аб задачах у кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Нарада аднагалосна прыняла зварот да ўсіх выбаршчыкаў, у якім заклікала іх 15 снежня аддаць свае галасы за Нікалая Васіевіча Кісялёва.

З вялікім уздымам перадвыбарчая нарада паслала прывітанне правадыру народаў таварышу Сталіну.

Перадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных Свіслацкай акругі

У памяшканні беларускай сярэдняй школы горада Свіслач адбыўся перадвыбарчы сход выбаршчыкаў Свіслацкай акругі № 82 па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных. Сход адкрыла настаўніца НСШ тав. Клейнерман.

З дакладам аб выбарах у мясцовыя Советы выступіў старшыня райвыканкома тав. Рубінштэйн. З прамовай выступіў кандыдат у дэпутаты абласнога Совета па Свіслацкай акрузе № 82 тав. Грыбаедаў Нікалай Іванавіч.

Сход аднадушна падтрымаў рашэнне сходаў рабочых скурзавода, калгаснікаў сельгасарцелі імені Молатава аб вылучэнні кандыдатам у абласны Совет тав. Н. І. Грыбаедава, намесніка старшыні Беластоцкага аблвыканкома. Удзельнікі схода прынялі зварот да ўсіх выбаршчыкаў акругі галасаваць у дзень выбараў за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных тав. Грыбаедава Нікалая Іванавіча.

Аднадушна прынята прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну.

Н. Болтрык,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ ДНІ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР АД МАЛДАЎСКАЙ ССР, АКЕРМАНСКАЙ і ЧЭРНАВІЦКАЙ АБЛАСЦЕЙ УКРАІНСКАЙ ССР, АД ЛІТОЎСКАЙ ССР, ЛАТВІЙСКАЙ ССР І ЭСТОНСКАЙ ССР.

1. Назначыць выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Малдаўскай ССР, Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР, ад Літоўскай ССР, Латвійскай ССР і Эстонскай ССР на 12 студзеня 1940 года.

2. Аб'явіць пачатак выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Совет СССР ад гэтых рэспублік і абласцей з 12 лістапада 1940 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 11 лістапада 1940 года.

ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ УССР АД АКЕРМАНСКАЙ І ЧЭРНАВІЦКАЙ АБЛАСЦЕЙ УКРАІНЫ

КІЕЎ, 11 лістапада. (ТАСС). Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета УССР на 12 студзеня 1941 г. назначаны выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет УССР ад Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украіны.

Пачатак выбарчай кампаніі ў гэтых абласцях аб'яўлен з 12 лістапада 1940 г. Створана 16 выбарчых акруг па выбарах у Вярхоўны Совет УССР: 7 у Акерманскай вобласці і 9 у Чэрнавіцкай вобласці.

У ВЦСПС

11 лістапада ўвечары з Масквы выехалі дэлегацыі працоўных Латвіі, Эстоніі і Малдавіі, прыязджаўшыя на святкаванне XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Перад ад'ездам у ВЦСПС адбыўся прыём дэлегацый працоўных новых саюзных рэспублік. На прыёме прысутнічалі сакратары ВЦСПС тт. Н. М. Шверпік, К. І. Нікалаева, С. Л. Брэгман, адказныя работнікі ВЦСПС і старшыні рада цэнтральных камітэтаў профсаюзаў.

Прадстаўнікі дэлегацый з натхненнем гаварылі аб парадзе на Краснай плошчы, аб сіле і магутнасці Чырвонай Арміі, аб грандыёзнай дэманстрацыі працоўных, якая паказала згуртаванасць совецкага народа вакол большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна.

Прыём у Крэмлі ўдзельнікаў Кастрычніцкага парада на Краснай плошчы, які адбыўся 7 лістапада 1940 года

Увечары 8 лістапада ў Крэмлі Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Ўрад СССР прымалі ўдзельнікаў ваеннага парада, які адбыўся на Краснай плошчы ў чэсць XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

К 19 гадзінам у Георгіеўскім зале і ў іншых залах Вялікага Крэмлёўскага палаца сабраліся байцы, камандзіры, палітработнікі, прадстаўнікі ўсіх родаў войск — пехацінцы, кавалерысты, артылерысты, лётчыкі, танкісты, маракі, інжынеры, тэхнікі, сувязісты, урачы. Усе гэты пламенныя совецкія патрыёты, якія няўтомнай працай памнажаюць магутнасць узброеных сіл Совецкага Саюза, умацоўваюць абарону сваёй магутнай соцыялістычнай радзімы. Тут прысутнічаюць члены ЦК ВКП(б), дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Вярхоўнага Совета РСФСР, народныя камісары, генералітэт Чырвонай Арміі, вышэйшае камандаванне Ваенна-Марскога Флота, Героі Совецкага Саюза, Героі Соцыялістычнай Працы, відныя дзеячы навукі і тэхнікі, стаханаўцы прамысловасці, майстры мастацтваў.

Сярод прысутнічаючых — маршалы Совецкага Саюза Будзённы, Шапашнікаў, Кулік, адмірал Кузнецоў, генерал арміі Мерэцкоў, генерал арміі Цюленеў, генерал-палкоўнік Гарадавікоў, таварышы Вышынскі, Вазнесенскі, Первухін, Бадаеў, Яраслаўскі, Лазоўскі, Нікалаева, Бенедзіктаў, Кафтанаў, Ваннікаў, Тэвасян, Вахрушэў, Шахурын, Зверэў, Міцерэў, Лукін, Седзін, Пронін, Храпчэнка, Героі Соцыялістычнай Працы Дзегцяроў, Токарэў, Шпітальны, Палікарпаў, Якаўлеў, Грабін, Іваноў, Крупчатнікаў, Героі Совецкага Саюза Смушкевіч, Молакаў, Белякоў, Бадзігін, Душкін, Леўчэнка, Грызадубава, Смірноў, Шэвелёў, Даронін, Бачкароў, Чэрнапятка, Арман, Аляксееў, Хрукін і іншыя.

Бурнымі воплескамі сустрэлі прысутныя паяўленне ў Георгіеўскім зале таварышоў В. М. Молатава, К. Е. Варашылава, Л. М. Кагановіча, М. І. Калініна, А. А. Андрэева, А. І. Мікаяна, Л. П. Берыя, Н. М. Шверніка, Г. М. Маленкова, С. К. Цімашэнка.

Народны камісар абароны, Герой Совецкага Саюза, Маршал Совецкага Саюза С. К. Цімашэнка сваё першае слова прысвяціў нашай доблеснай Чырвонай Арміі, яе героям і цёпла вітаў удзельнікаў святочнага парада на Краснай плошчы — байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Маскоўскага гарнізона.

Раздаецца захопленая авацыя, калі таварыш Цімашэнка праўзглашае здравіцу ў чэсць самага дарагога і любімага для ўсяго многамільённага совецкага народа чалавека, — у чэсць таварыша Сталіна, акружаючага выключнымі клопатамі і ўвагай Чырвоную Армію, пабацькоўску выхоўваючага герояў. Усе ўстаюць. Некалькі мінут працягваецца авацыя, грыміць магутнае чырвонаармейскае і чырвонафлоцкае «ура», чуюцца воклічы прывітанняў у чэсць таварыша Сталіна.

Затым тав. Цімашэнка звяртае слова прывітання к бліжэйшаму саратніку таварыша Сталіна, любімаму главе совецкага ўрада Вячаславу Міхайлавічу Молатаву. Гэта здравіца выклікае бурныя воплескі ўсіх прысутных.

Па прапанове таварыша Цімашэнка ўдзельнікі прыёму цёпла вітаюць старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Міхаіла Іванавіча Калініна.

З велізарным уздымам і натхненнем было сустрэта выступленне Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша В. М. Молатава, які праўзгласіў здравіцу за слаўную Чырвоную Армію, за ўсіх удзельнікаў парада на Краснай плошчы і ўдзельнікаў іншых парадаў, за тых, хто служыць у радах Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, за далейшы рост магутнасці нашых узброеных сіл, за маршалаў Чырвонай Арміі — маршалаў Совецкага Саюза таварышоў Варашылава, Цімашэнка, Будзённага, Шапашнікава, Куліка і за адмірала Кузнецова.

Громам апладысментаў адказалі прысутныя на словы таварыша Молатава. Гэта была гарачая дэманстрацыя любві байцоў, камандзіраў і палітработнікаў к сваёй Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту і сваім выдатным палкаводцам, дэманстрацыя бязмежнай адданасці радзіме, партыі Леніна—Сталіна, совецкаму ўраду.

Таварыш Молатаў горача вітаў таксама баявых падруг ваеннаслужачых — жонак камандзіраў, палітработнікаў і чырвонаармейцаў.

Прыём працягваўся некалькі гадзін. Для гасцей быў дан вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел віднейшыя артыстычныя сілы сталіцы. Канцэрт закончыўся выступленнем Чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі СССР.

Таварыш Цімашэнка па сканчэнні канцэрта цёпла вітаў ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі і яго мастацкага кіраўніка народнага артыста СССР прафесара А. В. Александрава. (ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ



Група лепшых агітатараў гродненскага шклозавода.
На здымку (злева направа) М. К. Кузняцоў, А. А. Пташкоўскі і М. Я. Воль.
Фота А. Сапіра

Сход ваўкавыскай раённай партарганізацыі

Раённы сход ваўкавыскай партыйнай арганізацыі абмеркаваў становішча партыйнай прапаганды і агітацыі, а таксама ход падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы.

З дакладам па першаму пытанню выступіў загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі райкома тав. Волнікаў.

— Кіруючы партыйны, совецкі і гаспадарчы актыў раёна,—указвае дакладчык,—не ўзяўся па-сур'ёзнаму за работу над сабой. З усіх членаў і кандыдатаў партыі толькі тры чалавекі закончылі вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

У сваім выступленні сакратар партарганізацыі чыгуначнага дэпо тав. Карпачэнка сказаў:

— З даклада бачна, што райком партыі недастаткова кіраваў работай партарганізацый па наладжванню вучобы комуністаў.

Намеснік загадчыка аддзелам прапаганды і агітацыі абкома партыі тав. Новікаў указаў, што ў раёне не вялася бальшэвіцкая работа па падбору і вырошчванню новых кадраў нізавога актыва і агітатараў.

Сакратар райкома тав. Смірноў у дакладзе аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў указаў:

— Першыя дні выбарчай кампаніі паказваюць, што ворагі ўсімі мерамі прабуюць пашкодзіць пасляховаму правядзенню гэтай вялікай палітычнай работы. Антысовецкія элементы на сходзе ў вёсцы Гальшка, карыстаючыся палітычнай блізарукасцю тав. Барыса, высунулі у састаў выбарчай камісіі сваіх агентаў—кулакоў і былых паліцэйскіх.

— Мы-б не мелі гэтых фактаў,—заяўляе ў сваім выступленні тав. Шчарбакоў,—калі-б створаныя агіткалектывы праводзілі сваю работу з насельніцтвам, а кіраўнікі агіткалектываў не перакідваліся з сельсовета ў сельсовет. Напрыклад, я працаваў кіраўніком агіткалектыва ў час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР у Дыхкоўскім сельсовеце, затым райком партыі пачаў перакідваць мяне з аднаго сельсовета ў другі: работа агітатараў спынілася. Так атрымалася з усімі агіткалектывамі і іх агітатарамі.

Сход прызнаў нездавальняючым становішча партыйнай прапаганды і агітацыі і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў.

Сход абавязаў усіх комуністаў прыкласці намаганні да таго, каб забяспечыць поўную перамогу блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Д. Казлоў.

Рост Граеўскай партарганізацыі

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнт).** За апошні час раённая партыйная арганізацыя прыняла ў свае рады новых таварышоў. Сярод новапрынятых лепшыя людзі раёна, на справе даказаўшыя сваю адданасць партыі Леніна — Сталіна.

Пярвічная арганізацыя станцыі Граева прыняла ў члены ВКП(б) лепшага стаханаўца службы руху тав. Магілка. Тав. Магілка актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці калектыва чыгуначнікаў. Ён з'яўляецца агітатарам і кіраўніком гуртка па вывучэнню выбарчых дакументаў. Гурток наведваюць члены саюза рабочых будаўнікоў.

На апошнім пасяджэнні райкома прынят у члены партыі тав. Кобзеў. Ён карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Тав. Кобзеў многа працуе над павышэннем свайго тэарэтычнага і культурнага ўзроўню. На прайшоўшай раённай канферэнцыі комсамола яго выбралі ў састаў райкома, а на абласной—дэлегатам 14-га з'езда комсамола Беларусі.

Нягодная практыка

29 кастрычніка ў Ваўкавыскім раёне паявіўся прадстаўнік аблупаўнаркамзага тав. Найдзёнаў. Ён зайшоў у райком партыі і прапанаваў неадкладна склікаць нараду партактыва горада. Сакратар райкома тав. Смірноў не спрабаваў супярэчыць прадстаўніку і прыняўся выконваць указанні Найдзёнава.

29 і раніцой 30 кастрычніка ва ўсіх установах і прадпрыемствах горада раздаваліся тэлефонныя званкі з райкома.

— Ало, ало! Вельмі тэрмінова! У 12 гадзін дня нарада. Забяспечце яўку ў райком партыі тав. Хайдэнкі. Перадайце аб гэтым тав. Жаркевічу. Няхай падыйдзе тав. Каялка.

Некаторыя з комуністаў спрабавалі супярэчыць:

— Як-так? Нельга-ж у рабочы час! Гэта-ж нарушэнне працоўнай дысцыпліны!

Дарэмна! Райкомаўцы настойліва патрабавалі выканання іх распараджэння.

Значыцца, нарада ў поўным зборы. З'явілася больш 20 чалавек.

Такая нягодная практыка ўвайшла ў прывычку кіраўнікоў раёна. Яны бесцэрамонна ў рабочы час склікаюць нарады, адклікаюць з работы і пасылаюць упаўнаважанымі на раён гаспадарчых работнікаў, па справе і без спраў выклікаюць у райком і райвыканком.

К. Еўдакімаў.

Дзейная дапамога сакратарам комсамольскіх арганізацый

У большасці комсамольскіх арганізацый міліцыі г. Беластока да кіраўніцтва прыйшлі маладыя кадры. Сакратаром комсамольскай арганізацыі абласнога ўпраўлення міліцыі з'яўляецца маладая ініцыятыўная комсамолка тав. Торапава. Сакратаром пярвічнай комсамольскай арганізацыі беластоцкага гарадскога аддзялення міліцыі абрана тав. Данілава, сакратаром 2-га — тав. Цітко, 3-га аддзялення — тав. Туркіна, 4-га — Блізняцова.

У мэтах аказання практычнай дапамогі новаабраным кіраўнікам комсамольскіх арганізацый, палітаддзел абласнога аддзялення міліцыі правёў семінар сакратароў і членаў камітэтаў пярвічных комсамольскіх арганізацый. Семінар прайшоў арганізавана і цікава. Першую лекцыю «Арганізацыйныя пытанні комсамольскіх арганізацый» прачытаў сакратар абкома ЛКСМБ тав. Стрыжак. Прачытаны таксама на семінары лекцыі і даклады аб рашэннях XI Пленума ЦК ВЛКСМ, аб рашэннях XIV з'езда ЛКСМБ і г. д.

Комсамольскія арганізацыі дзейна разгарнулі работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Комсамольская арганізацыя абласнога ўпраўлення выдзеліла для работы на выбарчых участках 20 комсамольцаў.

Е. Падгук.

Удзел комсамольцаў у мопраўскай рабоце

Нядаўна ў Саколкаўскім райкоме ЛКСМБ адбылася нарада мопраўскага актыва горада. Абмеркавана пытанне аб правядзенні выбараў у мопраўскіх арганізацыях раёна.

Выступіўшыя ў спрэчках тт. Канападкін, Казакевіч, Столяр і іншыя ўказалі на рад недахопаў у рабоце пярвічных мопраўскіх арганізацый і ўнеслі каштоўныя прапановы па паляпшэнню работы.

Пасля нарады актывісты адразу-ж прыступілі да выканання намечаных мерапрыемстваў. Ужо арганізавана некалькі новых пярвічных арганізацый МОПР'а. Зараз налічваецца ў раёне 20 арганізацый, у якія ўступіла 464 чалавекі.

Нядрэнна арганізавана мопраўская работа на скурзаводзе. Пярвічная арганізацыя завода налічвае 128 членаў. Актывісты МОПР'а тт. Столяр, Бубінец, Эдвард і іншыя праводзяць з рабочымі гутаркі па пытанню выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Ствараецца мопраўскі куток.

Комсамол раёна будзе і ў далейшым аказваць сістэматычную дапамогу ў рабоце мопраўскіх арганізацый.

С. Сталерман,
сакратар Саколкаўскага райкома комсамола.

Аб рэпертуары двух тэатраў

Тэатры Беластоцкай вобласці пачалі фарміравацца адразу-ж пасля 17 верасня 1939 года. Перажываючы цяжкасці арганізацыйнага перыяда, не маючы яшчэ цвёрдага творчага кірунку, згуртаванага калектыва, тэатры горача ўзяліся за пастаноўку новага рэпертуара. Перад тэатрамі наўстала пытанне, што ставіць. Яўрэйскі дзяржаўны тэатр адразу-ж узяўся за ажыццяўленне пастаноўкі п'есы совецкага драматурга П. Маркіша «Сям'я Овадзіс». І гэта натуральна. Тэатр гарэў жаданнем неадкладна арганічна зліцца з вялікай сям'ёй совецкіх тэатраў. Але адразу такое благароднае пачынанне тэатр не змог ажыццявіць паспяхова, бо не валодаў яшчэ творчым метадам совецкага тэатральнага мастацтва. Яўрэйскі тэатр вобмацкам шукаў шляхі да раскрыцця сутнасці совецкай п'есы.

«Сям'я Овадзіс», хоць і не раскрытая поўнасцю, дала магчымасць вылучыцца многім акторам (Марэўскі, Ляндау, Літвіна, Нісенцвейг).

Ужо другі спектакль «Крывавы жарт»—Шолам Алейхема, у якім удзельнічала таксама бакінская група артыстаў, даў выдатны выканаўчы ансамбль.

Затым была пастаўлена вясёлая, аснованая на фальклоры, музкамедыя «Гершэле Остраполер»—Гершэнзона.

Велізарным узлётам уверх, пасля тэатральнага прымітыва, з'явілася пастаноўка «Буры»—Шэкспіра, п'есы, самай цяжкай з усіх твораў геніяльнага драматурга. Пастаноўка яе была бясспрэчна заўчаснай. Прычынай некаторай няўпэўненасці ў выбары рэпертуара з'яўлялася таксама адсутнасць вопытнага мастацкага кіраўніцтва.

Выпрамляючы лінію рэпертуара, тэатр ажыццяўляе яшчэ дзве пастаноўкі: «Стэмпеню»— Ш. Алейхема і «Юліс»—совецкага драматурга Даніэля.

У 1941 годзе тэатр паставіць творы сусветных класікаў: «Урыэль Акоста»—Гуцкова, «Слуга двух паноў»—Гальдоні. Совецкі рэпертуар узбагаціцца п'есамі «Платон Крэчэт»—Карнейчука, «Справа Бейліса»—Шэйніна, «Каламейскія ткачы»—Грына і інш. Ажыццяўленне гэтага рэпертуара патрабуе ад тэатра максімум канцэнтрацыі сіл і магчымасцей калектыва, якія ў тэатры яшчэ далёка не выяўлены. Гэты рэпертуар дасць магчымасць поўнасцю раскрыць творчы воблік яўрэйскага дзяржаўнага тэатра.

***

Польскі дзяржаўны тэатр БССР таксама не прадстаўляў у пачатку поўнага і адзінага калектыва. Побач з наяўнасцю кваліфікаваных актораў мы мелі моладзь, толькі што скончыўшую тэатральныя навучальныя ўстановы, не давучаную і нават не маючую ніякай школы. Гэтыя істотныя цяжкасці былі пераможаны наяўнасцю ў тэатры моцнага і ўпэўненага мастацкага кіраўніка А. В. Венгерка. Ужо першая пастаноўка «Каварства і каханне»—Шылера ліквідавала разнабой у акторскім саставе. Першы спектакль адразу вызначыў творчае «я» тэатра.

Паследуючыя пастаноўкі — «Пажыццёвае»—Фрэдры, «Пігмаліён»—Б. Шоу, «Мараль пані Дульскай» і «Панна Малічэўская»—Г. Запольскай пераконваюць нас у велізарным дыяпазоне, якім уладае рэжысура і калектыў. Разрыў у падрыхтаванасці калектыва ліквідуецца штодзённай работай з моладдзю, якую вядуць рэжысёры Яблонка і Юно пад агульным кіраўніцтвам А. Венгерка. Вынікі гэтай работы ярка ілюструюцца спектаклем «Панна Малічэўская».

Цвёрда ідучы па намечанаму шляху, тэатр ажыццяўляе зараз пастаноўку «Аптымістычнай трагедыі»—совецкага драматурга Вс. Вішнеўскага. Гэта п'еса захапіла калектыў сваім рамантычным узлётам, сваім палкім дыханнем гарачых дзён грамадзянскай вайны, сваімі вялікімі чалавечымі страсцямі.

У 1941 годзе тэатр паставіць «Казку»—совецкага пісьменніка Светлова, якая таксама арганічна ўплятаецца ў творчы кірунак тэатра. У плане тэатра стаяць класічныя творы «Лес»—Астроўскага, «Вяселле Фігаро»—Бамаршэ і інш. Тэатр мае намер па-новаму ажыццявіць пастаноўкі прагрэсіўных польскіх аўтараў. Перад калектывам тэатра стаіць важная і адказная задача наладжвання сувязі з мясцовымі аўтарамі.

Нашы тэатры наогул павінны прызадумацца над выбарам п'ес з багатай совецкай драматургіі. Тэатры павінны паказваць лепшыя творы совецкіх аўтараў, якія глыбей, паўней і больш правільна адлюстроўваюць будні нашай цудоўнай краіны.

А. Атрошчанка.

Ленін і Сталін у Кастрычніцкія дні

У студзені 1924 года на вечары крэмлёўскіх курсантаў, прысвечаным памяці Леніна, Сталін сказаў:

«Ленін быў народжан для рэволюцыі. Ён быў сапраўды геніем рэволюцыйных узрываў і найвялікшым майстрам рэволюцыйнага кіраўніцтва. Ніколі ён не адчуваў сябе так свабодна і радасна, як у эпоху рэволюцыйных патрасенняў... ніколі геніяльная празорлівасць Леніна не праяўлялася так поўна і выразна, як у часе рэволюцыйных узрываў. У дні рэволюцыйных паваротаў ён літаральна расцвітаў, станавіўся яснабачцам, прадугадваў рух класаў і магчымыя зігзагі рэволюцыі, бачачы іх, як на далоні».

Гэтыя словы з поўным правам трэба аднесці і да самога Сталіна, вернага вучня Леніна, бліжэйшага друга яго і саратніка.

Магутны геній правадыроў і стваральнікаў большэвіцкай партыі ў Кастрычніцкія дні 1917 года праявіў сябе ва ўсёй сіле. Партыя Леніна—Сталіна ў гэты рашаючы момант сусветнай гісторыі з чэсцю вытрымала найвялікшае выпрабаванне, пераадолела ўсе цяжкасці. Яна злучыла ў агульны рэволюцыйны паток барацьбу рабочага класа за соцыялізм, сялянства за зямлю, прыгнечаных нацыянальнасцей за роўнапраўе, шырокіх мас народа за мір, дабілася звяржэння капіталізма і ўстанаўлення дыктатуры пролетарыята.

На VI з'ездзе (26-VII—3-VIII), кіруемым Леніным з падполля, па дакладах таварыша Сталіна былі прыняты гістарычныя рашэнні, нацэліўшыя партыю на ўзброенае паўстанне, на соцыялістычную рэволюцыю. Набліжаўся момант рашучай схваткі з буржуазіяй.

Канец верасня 1917 года характарызаваўся карэнным пераломам у развіцці рускай рэволюцыі. У краіне ўсё шырэй разлівалася хваля сялянскіх паўстанняў. Рабочыя, не абмяжоўваючыся стачкамі і дэманстрацыямі, пачыналі захватваць фабрыкі і заводы. Пасля разгрому карнілаўшчыны, у барацьбе з ёю ўмацаваліся захірэўшыя было Советы і адзін за другім станавіліся большэвіцкімі. Уплыў нашай партыі рос не па днях, а па гадзінах. У верасні на выбарах у раённыя думы Масквы 51 проц. усіх выбаршчыкаў аддалі свае галасы большэвікам. На акраінах Расіі ўсё вышэй узнімаўся нацыянальна-вызваленчы рух.

Часовы ўрад ліхарадачна збіраў контррэволюцыйныя сілы і, рыхтуючы новую карнілаўшчыну, сцягваў да сталіцы казачыя дывізіі, ударныя батальёны, юнкераў, польскі і чэхаславацкі корпусы. Керэнскія збіраліся ва што-б та ні стала разграміць рэволюцыйны пролетарыят і мелі намер аддаць Піцер немцам.

Адзіным выратаваннем з гэтага крызіса для Расіі быў выхад, указваемы большэвіцкай партыяй, Леніным, — пераход улады ў рукі Советаў, соцыялістычная рэволюцыя. «Большэвікі могуць і павінны ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі», — пісаў у сярэдзіне верасня 1917 года Ленін, які скрываўся ў падполлі ў Фінляндыі, Цэнтральнаму Петраградскаму і Масноўскаму камітэтам нашай партыі.

У другім пісьме, напісаным у гэтыя-ж дні, Ленін, развіваючы вывад аб неабходнасці ўзяцця большэвікамі ўлады, аналізіруе ўмовы, пры якіх паўстанне можа быць паспяховым. Ленін указвае, што паўстанне павінна апірацца «на перадавы клас», «на рэволюцыйны ўздым народа» і «на такі **пераломны пункт** у гісторыі нарастаючай рэволюцыі, калі актыўнасць перадавых радоў народа найбольшая, калі мацней за ўсё **хістанні** ў радах ворагаў і **ў радах слабых палавінчатых нерашучых прыяцеляў рэволюцыі».** Гэтыя ўмовы ў верасні 1917 года былі ў наяўнасці ў Расіі.

Ленін развівае канкрэтны план паўстання, патрабуючы «аднесціся да паўстання па-марксісцку, г. зн. як да майстэрства». Гэта азначала, што, правільна выбраўшы момант паўстання, трэба было, не трацячы ні мінуты, «арганізаваць **штаб** паўстанцкіх атрадаў, размеркаваць сілы, рушыць верныя палкі на самыя важныя пункты, акружыць Александрынку, заняць Петрапаўлаўку, арыштаваць генеральны штаб і ўрад, паслаць да юнкераў і да дзікай дывізіі такія атрады, якія здольны загінуць, але не даць непрыяцелю рушыць к цэнтрам горада; мы павінны мабілізаваць узброеных рабочых, заклікаць іх да адчайнага апошняга бою, заняць адразу тэлеграф і тэлефон, змясціць **наш** штаб паўстання ля цэнтральнай тэлефоннай станцыі, звязаць з ім па тэлефону ўсе заводы, усе палкі, усе пункты ўзброенай барацьбы і т. д.».

Выступіўшы на пасяджэнні ЦК 15 (28) верасня таварыш Сталін поўнасцю падтрымаў палажэнні, развітыя Леніным, і прапанаваў разаслаць ленінскія пісьмы для абмеркавання ў найбольш важныя арганізацыі партыі. Цэнтральны Камітэт адхіліў на гэтым пасяджэнні гнусную прапанову Каменева, — знішчыць ленінскія пісьмы.

У поўнай адпаведнасці з дырэктывамі Леніна, Сталін у цэнтральным органе партыі «Рабочий путь» вёў агітацыю за падрыхтоўку паўстання. Ленін тады-ж даў выключна высокую ацэнку гэтай рабоце Сталіна і кіруючым сталінскім артыкулам у «Рабочем пути». З падполля Владзімір Ільіч безупынна падтрымліваў сувязь са Сталіным і ЦК. У тэтыя дні Владзімір Ільіч напісаў рад артыкулаў для «Рабочего пути» і большэвіцкага журнала «Просвещение», рад пісем у партыйныя камітэты, усебакова рыхтуючы партыю да паўстання. У сваіх пісьмах і артыкулах Ленін бічаваў Каменева, Зіноўева і іх аднадумшчыкаў, якія прабавалі адцягнуць партыю з шляху ўзброенага паўстання.

У сувязі з нарастаннем падзей 3 (16) кастрычніка 1917 года ЦК большэвікоў дазволіў Ільічу «перабрацца ў Піцер, каб была магчыма пастаянная і цесная сувязь». 7 кастрычніка Владзімір Ільіч на паравозе нелегальна прыехаў у Петраград і пасяліўся на кватэры Фафанавай на выбаргскай старане. Праз некалькі гадзін 8 кастрычніка ў Владзіміра Ільіча быў Сталін. Сталін азнаёміў Ільіча са становішчам у Піцеры. Правадыры большэвіцкай партыі разам намецілі план далейшай падрыхтоўкі соцыялістычнай рэволюцыі. У гэты-ж дзень Владзімір Ільіч напісаў свае славутыя «Парады пастаронняга».

У класічных па сваёй сціласці, канкрэтнасці і глыбіні радках Ленін даваў партыі ясныя і чоткія дырэктывы. У гэтыя-ж дні Ленін напісаў свае пісьмы піцерскай гарадской партыйнай канферэнцыі і большэвікам, прымаючым удзел на абласным з'ездзе Советаў Паўночнай вобласці.

10 (23) кастрычніка 1917 года Ленін паявіўся на пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта. Члены ЦК радасна віталі свайго настаўніка і друга. Ленін выступіў на гэтым гістарычным пасяджэнні ЦК з дакладам па бягучаму моманту. Владзімір Ільіч указаў, што «палітычна справа зусім назрэла для пераходу ўлады...» і патрэбаваў усебаковай тэхнічнай падрыхтоўкі паўстання. Прапанаваная Леніным рэзалюцыя аб узброеным паўстанні была прынята ўсімі галасамі супроць галасоў здраднікаў — Каменева і Зіноўева, прадракаўшых паўстанню паражэнне і паклёпніцка сцвярджаўшых, што ў рабочага класа няма сіл для ўзяцця ўлады. Іудушка-Троцкі на гэтым пасяджэнні ўнёс здрадніцкую папраўку, прапанаваўшы адкласці пачатак паўстання, адтэрмінаваць яго да адкрыцця II з'езда Советаў. Гэта азначала—расшыфраваць дзень паўстання Часоваму ўраду і даць контррэволюцыі магчымасць сабраць свае сілы. ЦК адхіліў гэтую здрадніцкую «папраўку».

Большэвіцкая партыя, падрыхтоўваючы ўзброенае паўстанне, вяла актыўную работу па мабілізацыі ўсіх сіл пролетарскай рэволюцыі. 13 (26) кастрычніка 1917 года ў цэнтральным органе партыі «Рабочий путь» Сталін у артыкуле «Улада Советаў», звяртаючыся да рабочых, салдат і сялян, пісаў: «Надышоў момант, калі рэволюцыйны лозунг «Уся ўлада Советам» павінен быць, нарэшце, ажыццёўлен» ЦК большэвіцкай партыі разаслаў на месцы ўпаўнаважаных для арганізацыі паўстання. 12 (25) кастрычніка па дырэктыве партыі пры Петраградскім Совеце быў створан Ваенна-рэволюцыйны камітэт, які стаў легальным штабам паўстання. Ленін і Сталін усе дні непасрэдна кіравалі яго работай.

16 (29) кастрычніка адбылося скліка080 па прапанове Леніна пашыранае пасяджэнне ЦК партыі. Владзімір Ільіч выступіў з дакладам аб рашэнні ЦК ад 10 кастрычніка. Свой даклад Ільіч закончыў словамі: «З палітычнага аналіза класавай барацьбы і ў Расіі і ў Еўропе выцякае неабходнасць самай рашучай, самай актыўнай палітыкі, якая можа быць толькі ўзброенае паўстанне».

Каменеў і Зіноўеў на гэтым пасяджэнні зноў выступілі супроць



В. І. Ленін і І. В. Сталін у Смольным. 1917 год.
З рысунка мастака П. Васільева. Фота-клішэ ТАСС.

Да выбараў у мясцовыя Советы Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей Беларускай ССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР разгледзеў і ўстанавіў формы выбарчых дакументаў па выбарах у мясцовыя Советы Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей БССР: выбарчыя бюлетэні па выбарах у сельскія, пасялковыя і гарадскія Советы (белага колеру); выбарчы бюлетэнь па выбарах у раённыя Советы (светла-блакітнага колеру); выбарчы бюлетэнь па выбарах у абласныя Советы (светлазялёнага колеру); пасведчанне на права галасавання пры змене выбаршчыкам месца свайго прабывання, згодна артыкула 20 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР»; формы пасведчанняў аб выбранні дэпутатаў; формы пратаколаў галасавання па выбарах у мясцовыя Советы, якія складаюцца ўчастковымі і акруговымі выбарчымі камісіямі, і формы спіскаў выбаршчыкаў асноўных і для галасавання па пасведчаннях на права галасавання.

Формы выбарчых бюлетэняў

Выбарчы бюлетэнь

па выбарах у ______ абласны Совет дэпутатаў працоўных

15 снежня 1940 года

______ акруга №____

Прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты	Кім выстаўлен кандыдатам у дэпутаты

Акруговая выбарчая камісія па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных

Выбарчы бюлетэнь

па выбарах у ______ раённы Совет дэпутатаў працоўных ______ вобласці, Беларускай ССР

15 снежня 1940 года

______ акруга №____

Прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты	Кім выстаўлен кандыдатам у дэпутаты

Акруговая выбарчая камісія па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных

Выбарчы бюлетэнь*)

па выбарах у ______ гарадскі Совет дэпутатаў працоўных ______ раёна, ______ вобласці, Беларускай ССР

15 снежня 1940 года

№ ____ акругі

Прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты	Кім выстаўлен кандыдатам у дэпутаты

Акруговая выбарчая камісія па выбарах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных

*) Такімі-ж з'яўляюцца формы выбарчых бюлетэняў па выбарах у сельскі і пасялковы Советы дэпутатаў працоўных. (БЕЛТА).

НАРАДА ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

КНЫШЫН. **(Ад нашага карэспандэнта).** Тут адбылася раённая нарада старшынь і сакратароў акруговых і сельскіх выбарчых камісій. Удзельнікі нарады заслухалі даклад старшыні райвыканкома тав. Арцюхава аб задачах выбарчых камісій у перыяд падрыхтоўкі да выбараў.

Старшыня сельскай выбарчай камісіі па выбарах у Вышаводскі сельскі совет тав. Хайноўскі заявіў:

— Сяляне нашай вёскі дружна ўключыліся ў выбарчую кампанію. Яны праяўляюць велізарную зацікаўленасць да вывучэння выбарчай літаратуры. Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон вывучаюць 130 сялян і сялянак. Ідзе абсталяванне выбарчага ўчастка. Актыў дапамагае сельсовету своечасова скласці і вывесіць спіскі выбаршчыкаў.

У заключэнне ўдзельнікі нарады азнаёміліся з пытаннямі арганізацыйна-тэхнічнай работы. У рабоце нарады ўдзельнічала 137 чалавек.

В. Г.

—o—

Вучоба агітатараў

Па ініцыятыве Саколкаўскага райкома партыі, для агітатараў з мясцовага гарадскога і сельскага актыва, без адрыву ад вытворчасці арганізаваны шасцідзённыя курсы.

Праграма курсаў прадугледжвае цыкл лекцый па Канстытуцыі СССР і БССР, Палажэнне аб выбарах, Ленін і Сталін аб нацыянальнай палітыцы і аб міжнародным становішчы.

605 агітатараў закончылі ўжо вучобу і прыступілі да агітацыйнай работы. Курсы пройдуць яшчэ 130 чалавек агітатараў.

Пры кожным сельсовеце арганізаван агіткалектыў. Агіткалектывамі кіруюць тэарэтычна падрыхтаваныя комуністы.

Г. Майсееў.

—o—

Сяляне - агітатары

Пры Ломжынскай МТС у жніўні арганізаван агіткалектыў. У яго ўваходзіць каля 20 агітатараў— настаўнікі і найбольш пісьменныя сяляне-актывісты. Кіруе агіткалектывам памочнік дырэктара МТС па палітчасці тав. Салтановіч. Праведзена значная работа сярод сялян навакольных вёсак. Агітатары вывучылі з сялянамі Ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, пастановы СНК і ЦК партыі. Цяпер разгорнута вывучэнне Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Асабліва вылучаюцца агітатары: маладая дзяўчына-сялянка вёскі Сулімы Сцепаніда Янкоўская, селянін вёскі Дзержкі Вацлаў Купеўскі, настаўнікі Ян Ляскоўскі, Зося Мард'еўская, селянін вёскі Хмелева Франц Кавальчка і іншыя.

Сярод насельніцтва агітатары працуюць сістэматычна, вывучаюць Канстытуцыю, даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі.

П. Грышчанка.



Кастрычніцкая дэманстрацыя ў горадзе Беластоку.
На здымку: калона дэманстрантаў беластоцкага мясакамбіната.

Фота А. Сапіра.

ШЛЯХ ГЕРОЯ

Жыў ён у захалуснай вёсцы на Харкаўшчыне. Рэволюцыя прынесла новае жыццё, аб якім не смелі нават марыць ні бацька яго, ні дзед і ні прадзед...

З вёскі Мітрафан Пятровіч пайшоў рана. У 16 год ён працаваў ужо слесарам на адным з авіяцыйных заводаў краіны. Але работа гэта не задавальняла яго. Хацелася папасці куды-небудзь у такое месца, дзе быў-бы прастор для ініцыятывы.

У 1932 годзе Мітрафан Пятровіч Нога—курсант адной з авіяцыйных школ.

Ва ўмовах мірнай вучобы трэніраваў сябе лётчык—знішчальнік, комуніст тав. Нога, каб у любую мінуту быць гатовым да схваткі з любым ворагам і перамагчы яго ў славу сваёй дарагой радзімы.

Краіна паклікала яго на выкананне свяшчэннага доўгу.

Лета 1939 года застала камандзіра падраздзялення тав. Ногу ў далёкай брацкай Манголіі. Аб халхін-голскіх падзеях ведае ўвесь свет. Нямала ворагаў на Халхін-Голе знішчыў храбры сталінскі сокал Мітрафан Пятровіч.

...Гарачыня нясцерпная. Сонца ўжо даўно пераваліла за поўдзень. На лётным полі, у поўнай баявой гатоўнасці, прыціхлі «ястрэбкі». У 2 гадзіны дня знойнае паветра нечакана разарвала сігнальная ракета.

— Трывога!

Мігам зараўлі маторы. Адзін за другім у паветра рынуліся шэрыя «ястрэбкі». Праз 15 мінут — бой. Бой няроўны, жорсткі. 27 самурайскіх знішчальнікаў беспаспяхова атакуюць невялікую групу нашых «ястрэбкоў». Падтрымліваючы ў баі адзін другога, лётчыкі-знішчальнікі, сярод якіх і тав. Нога, выкарыстоўваюць усё сваё майстэрства, каб з найменшымі стратамі знішчыць праціўніка. 50 мінут працягваўся бой.

Ужо 15-ты па ліку збіт самурайскі знішчальнік, а бой яшчэ толькі разгараецца...

4 гадзіны працягвалася паветраная схватка, і амаль палову знішчаны вораг уцёк. 39 варожых самалётаў падабралі на нашай тэрыторыі, ля самай граніцы.

Аднойчы Мітрафана Пятровіча выклікалі ў штаб. Камандзір часці загадаў знішчыць самалёты ворага, карэктыруючыя агонь артылерыі. Трэба было прайсці незаўважанымі лінію фронта і, абрушыўшыся раптам на аэрадром ворага, знішчыць іх самалёты.

Ішлі на вялікай вышыні, над воблакамі. Калі прабілі воблакі, рынуліся на раскінуўшыйся ўнізе аэрадром ворага. Ні агонь непрыяцельскіх кулямётаў, ні спробы ворага запужаць лабавой атакай не спынілі мужнага лётчыка. Знішчаючы самурайскія самалёты на зямлі і ў паветры, ён з чэсцю выканаў заданне камандавання.

Ёсць аб чым успамінаць Мітрафану Пятровічу. 48 разоў быў ён у паветраных баях, не адзін дзесятак варожых самалётаў знішчыў меткім агнём сваёй баявой машыны.

Неўвядаемай славай пакрылі сябе совецкія лётчыкі ў гэтых баях. Многіх з іх совецкі ўрад узнагародзіў ордэнамі і медалямі. Некалькі сталінскіх сокалаў атрымалі вышэйшую ўзнагароду краіны—званне Героя Совецкага Саюза. Сярод іх— Мітрафан Пятровіч Нога.

... І зноў наступілі мірныя будні баявой вучобы. Як і раней, няўтомна ўдасканальвае сваю баявую вывучку комуніст, Герой Совецкага Саюза, маёр тав. Нога.

Александр Окунеў.

Цікавы вечар

Цікава прайшоў вечар, прысвечаны 23 гадавіне Вялікага Кастрычніка, у друкарні «Беластокдрук». Пасля даклада адбылося ўручэнне пераходнага чырвонага сцяга лепшаму цэху—наборнаму. Для атрымання сцяга на трыбуну выклікаюцца стаханаўцы тт. Клечэўскі, Шафранскі і Пянко. Тав. Клечэўскі запэўніў прысутных, што наборны цэх не ўступіць пяршынства і ў далейшым.

На вечары адбылося прэміраванне рабочых-стаханаўцаў. Прэміі атрымалі наборшчыкі тт. Пянко і Клечэўскі, гравёр Шафранскі, друкары-машыністы тт. Клімчак і Грыбок, брыгадзір пераплётнага цэха тав. Матэйчык, работніцы Закшэўская, Дмохер і Сяргеевіч.

На вечары выступілі паэты Юрый Равіч і Іосіф Рубінштэйн.

Затым пачаўся паказ мастацкай самадзейнасці. Драмгурток, якім кіруе наборшчык Шлёма Козак, даў рад дэкламацый на польскай, яўрэйскай і рускай мовах.

Л. Райскі.

—o—

Канцэрт у музыкальнай школе

5 лістапада ў музыкальнай школе адбыўся канцэрт, прысвечаны XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

У вялікай, прыгожа аформленай зале школы сабраліся выкладчыкі, вучні школы, студэнты вучылішча і бацькі. З вялікай увагай заслухалі яны даклад аб міжнародным становішчы і аб дасягненнях Совецкага Саюза за годы совецкай улады.

Пасля даклада адбыўся канцэрт у выкананні настаўнікаў музыкальнай школы. У канцэрце ўдзельнічалі педагогі і салісты Беластоцкай філармоніі Бакман (віялачэль), Калецкі (раяль), Гутман (скрыпка) і Петрачэнка (барытон).

Ю. Лава.

узброенага паўстання. Гэтыя капітулянты і здраднікі былі выкрыты таварышам Сталіным: «Тое, што прапануюць Каменеў і Зіноўеў, аб'ектыўна прыводзіць да магчымасці для контррэволюцыі зарганізавацца». На гэтым-жа пасяджэнні па прапанове Леніна быў выбран Партыйны цэнтр па кіраўніцтву паўстаннем на чале з таварышам Сталіным.

У той-жа дзень і затым на наступны — 17 (30) кастрычніка Владзімір Ільіч напісаў пісьмо «К таварышам», у якім зло высмеяў капітулянцкія довады Каменева і Зіноўева супроць паўстання. Але гнусныя штрэйкбрэхеры рэволюцыі, пацярпеўшы паражэнне ў сваіх спробах перашкодзіць прыняццю ленінскага плана паўстання, зрабілі новае нечуванае здрадніцтва. 18 кастрычніка яны выступілі ў меншавіцкай газеце «Новая жизнь» супроць большэвіцкай партыі і яе ЦК, раскрыўшы буржуазіі сакрэтнае рашэнне партыі аб паўстанні. Гэта было здрадай, пагражаўшай сарваць падрыхтоўваемае паўстанне, прамой дапамогай контррэволюцыі. Ленін рэзка заклаймiў штрэйкбрэхерства Каменева і Зіноўева і паставіў перад ЦК пытанне аб выключэнні абодвух здраднікаў з партыі.

Падбадзёраны штрэйкбрэхерамі ўрад Керэнскага стаў прымаць меры, каб задушыць падрыхтоўваемае паўстанне. Усе сілы контррэволюцыі былі мабілізаваны. Керэнскі распрацаваў план разгрому большэвікоў напярэдадні II з'езда Советаў, назначанага на 25 кастрычніка (7 лістапада). Але кіруемая Леніным і Сталіным большэвіцкая партыя паскорыла збіранне рэволюцыйных сіл. 12.000 чырвонагвардзейцаў былі падрыхтаваны да выступлення па першаму заклiку партыі. З Петрапаўлаўскай крэпасці для чырвонагвардзейцаў была вывезена зброя. Ваенна-рэволюцыйны камітэт назначыў сваіх камісараў ва ўсе воінскія часці. Лік гэтых камісараў быстра дасягнуў 600 чалавек. Без санкцыі Ваенна-рэволюцыйнага камітэта і яго камісараў загады камандавання ў часцях не выконваліся. Планы Часовага ўрада былі вядомы ЦК большэвікоў. 21 кастрычніка (3 лістапада) на пасяджэнні ЦК па прапанове Сталіна было рашана даручыць Леніну падрыхтаваць асноўныя даклады і рашэнні II з'езда Советаў: аб міры, аб зямлі і аб уладзе. ЦК даручыў Сталіну і Свердлову кіраўніцтва большэвіцкай фракцыяй з'езда Советаў. Сталіну і Дзержынскаму — кіраўніцтва работай у Петраградскім Выканаўчым Камітэце Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Падрыхтоўка паўстання ішла поўным ходам.

На пасяджэнні Петраградскага Совета Троцкі здрадніцка выбалтаў тэрмін паўстання ворагам, і ЦК рашыў пачаць паўстанне раней— 24 кастрычніка (6 лістапада).

У гэты дзень з раніцы Керэнскі пачаў сваё выступленне супроць большэвікоў. У 6 гадзін юнкеры ўварваліся ў рэдакцыю і друкарню цэнтральнага органа большэвікоў «Рабочий путь». На выручку «Рабочего пути» па ўказанню таварыша Сталіна рушылі браневікі знаходзіўшагася пад уплывам большэвікоў аўта-бронедывізіёна і Чырвоная гвардыя. Рэдакцыя і друкарня былі быстра адбіты, і к 11 гадзінам раніцы быў выпушчан чарговы нумар «Рабочего пути». У перадавым артыкуле «Што нам трэба», напісаным Сталіным, партыя заклікала да звяржэння Часовага ўрада.

У Смольным адбылося пасяджэнне ЦК большэвікоў. ЦК даручыў Дзержынскаму забяспечыць занятце пошты і тэлеграфа, Свердлову —назіраць за кожным крокам Часовага ўрада. Рашана было неадкладна выклікаць флот і маракоў з Кранштадта. Паўстанне разгортвалася па плану, намечанаму Владзімірам Ільічом.

Ленін ў гэты час знаходзіўся на кватэры Фафанавай. На пасланае ім праз Выбаргскі раённы камітэт запытанне аб магчымасці яго прыбыцця ў Смольны Сталін адказаў, што зараз выходзіць небяспечна. У гэтыя гадзіны Ленін напісаў сваё славутае пісьмо членам ЦК з патрабаваннем:

«Ні ў якім выпадку не пакідаць улады ў руках Керэнскага і кампаніі да 25-га, ніякім чынам; рашаць справу сёння абавязкова вечарам або ноччу».

Сталін і Цэнтральны Камітэт дакладна выконвалі гэтую дырэктыву Леніна.

Вечарам Владзімір Ільіч, пагарджаючы небяспекай, загрыміраваўшыся, пайшоў у Смольны, пакінуўшы сваёй гаспадыні запіску: «Пайшоў туды, куды Вы не хацелі, каб я ішоў. Да пабачэння. Ільіч».

Разам са Сталіным Ленін узяў у свае рукі непасрэднае кіраўніцтва ўзброеным паўстаннем.

Кастрычніцкая рэволюцыя пачалася, і адразу прыйшлі ў рух атрады арганізаваных большэвікамі байцоў. У ноч з 24 на 25 кастрычніка (7 і 8 лістапада) былі заняты вакзалы, масты, пошта, тэлеграф, міністэрствы, Дзяржаўны банк. Да раніцы амаль увесь горад быў у руках паўстаўшых рабочых і салдат. У 10 гадзін раніцы 25 кастрычніка (7 лістапада) Владзімір Ільіч напісаў славуты зварот да грамадзян Расіі:

«Часовы ўрад скінут. Дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі органа Петраградскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў — Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, стаячага на чале петраградскага пролетарыята і гарнізона».

У гэтыя гістарычныя гадзіны і дні, узрушыўшыя свет, Ленін і Сталін у самым цэнтры паўстання разам кіравалі Кастрычніцкай рэволюцыяй, накіроўваючы і арганізуючы рэволюцыйныя атрады пролетарыяў, матросаў і салдат на штурм Зімняга палаца, даючы дырэктывы аб паўстанні на месцы, звязваючыся з большэвікамі ва ўсіх канцах Расіі. Радыёстанцыя крэйсера «Аврора», першая большэвіцкая радыёстанцыя, ужо кідала ў эфір палкія словы аб новай пролетарскай уладзе, аб толькі што нарадзіўшайся дыктатуры пролетарыята. У 2 гадзіны 30 мінут дня 25 кастрычніка (7 лістапада) у Смольным адкрылася экстранае пасяджэнне Петраградскага Совета. Бурай захаплення сустрэў зал Леніна. Владзімір Ільіч выступіў з дакладам аб задачах улады Советаў. Ён гаварыў:

«Рабочая і сялянская рэволюцыя, аб неабходнасці якой увесь час гаварылі большэвікі, адбылася».

Вечарам у Смольным адкрыўся II з'езд Советаў. Ленін напісаў зварот з'езда «Да рабочых, салдат і сялян», які аб'яўляў аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Советаў. Гэты зварот быў прыняты з'ездам з велізарным натхненнем. Ленін і Сталін на вячэрнім пасяджэнні з'езда 25 кастрычніка прысутнічаць не маглі. Правадыры Кастрычніцкай рэволюцыі кіравалі арганізацыяй штурма Зімняга палаца і былі заняты вырашэннем надзённейшых для рэволюцыі пытанняў аб забеспячэнні Піцера хлебам. Хлеба ў сталіцы асталося на два дні. Контррэволюцыя хацела голадам задушыць паўстаўшы пролетарыят. Ленін і Сталін арганізавалі некалькі ўзброеных атрадаў, якія абыскалі ўсе чыгуначныя пуці і вакзалы і выявілі дзесяткі вагонаў з хлебам. Гэта забяспечвала горад на некаторы тэрмін харчамі.

Напружаная работа Леніна і Сталіна ў Смольным прадаўжалася ўсю ноч. У трэцяй гадзіне раніцы 26 кастрычніка (8 лістапада) чырвоны сцяг Советаў узвіўся і над Зімнім палацам.

26 кастрычніка (8 лістапада) раніцой Ленін напісаў дэкрэт аб зямлі. У гэты-ж дзень Ільіч разам са Сталіным правёў пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта, які абмеркаваў пытанне аб саставе першага Совецкага ўрада. Калі нехта з прысутных стаў адмаўляцца ад назначэння на пост народнага камісара, спасылаючыся на адсутнасць вопыту, Владзімір Ільіч заразіцельна рассмяяўся: «А вы думаеце ў каго-небудзь з нас ёсць такі вопыт?»

У 9 гадзін вечара 8 лістапада адкрылася другое пасяджэнне з'езда Советаў. Цяжка перадаць захапленне, з якім дэлегаты сустрэлі Леніна. Побач з Владзімірам Ільічом стаяў і яго бліжэйшы друг і саратнік — Сталін. На гэтым гістарычным начным пасяджэнні з'езда па дакладах Леніна былі прыняты дэкрэты аб міры, аб зямлі і ўтвораны першы Совецкі ўрад. Ленін быў выбран Старшынёй Совета Народных Камісараў, Сталін — Старшынёй па справах нацыянальнасцей. Пазней, у канцы 1917 года, у дні, калі Ленін адсутнічаў у Соўнаркоме, яго замяшчаў на пасту Старшыні Сталін.

27 кастрычніка (9 лістапада), на трэці дзень Кастрычніцкай рэволюцыі, Ленін і Сталін жалезнай рукой арганізоўвалі абарону Петраграда ад войск Керэнскага, які ўзяў Гатчыну. Разам са Сталіным Владзімір Ільіч з'явіўся ў штаб рэволюцыйных войск, праверыў план абароны і ўнёс у яго істотныя папраўкі. «Урад рабочых і сялян жадае ведаць, як дзейнічаюць яго ваенныя ўлады», заявіў Ільіч у штабе. Усё было паднята партыяй на справу абароны рэволюцыйнага Піцера. Вечарам Владзімір Ільіч размаўляў па прамому проваду з Гельсінгфорсам і выклікаў у Петраград ваенныя судны Балтыйскага флота.

9 лістапада цэнтральны орган партыі зноў выйшаў пад слаўнай старой баявой большэвіцкай назвай «Правда».

Смольны ззяў у гэтую ноч тысячамі агнёў. Штаб соцыялістычнай рэволюцыі вёў гіганцкую работу па разгортванню барацьбы за пераход улады ў рукі Советаў ва ўсёй краіне. Да Леніна і Сталіна бесперапыннай чарадой ішлі рабочыя, салдаты, матросы, сяляне, народныя камісары і члены ВЦВК. Адсюль, з пакоя ў Смольным, ва ўсе канцы краіны—у Маскву і на Урал, у Кіеў і на Волгу ішлі ленінскія ўказанні, дырэктывы, дэкрэты, адсюль накіраваліся на месцы пасланцы партыі, каб рухаць уперад справу соцыялістычнай рэволюцыі.

У вялікім садружастве кіравалі Ленін і Сталін большэвіцкай партыяй і пролетарскай рэволюцыяй. Геніі рэволюцыйнай барацьбы, правадыры комунізма ўзнялі партыю, мабілізавалі яе, накіравалі на ўзброенае паўстанне. Партыя павяла за сабой рабочы клас і шырокія масы бядняцкага сялянства, і вялікая перамога Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі—звяржэнне ўлады капіталістаў і ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята—была атрымана.

Пачалася новая глава сусветнай гісторыі чалавецтва.

А. Піцерскі.

ЗА РУБЯЖОМ

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 11 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што налёты непрыяцельскай авіяцыі на Англію, якія мелі месца ў ноч на 11 лістапада, не адрозніваліся асобай інтэнсіўнасцю, але ў параўнанні з папярэдняй ноччу насілі некалькі больш шырокі характар. Германская авіяцыя скідвала бомбы на некаторыя пункты, галоўным чынам у раёне вусця Тэмзы і паўднёвага ўзбярэжжа Англіі. Бамбардыроўка прычыніла значныя разбурэнні і выклікала чалавечыя ахвяры. Германскія самалёты скінулі некаторую колькасць бомб над Лонданам. Пачаўшыяся пажары, адзін з якіх прыняў буйныя размеры, былі лакалізаваны. Разбурана некаторая колькасць жылых будынкаў і гандлёвых прадпрыемстваў. Чалавечыя ахвяры невялікія.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што англійская авіяцыя ў час сваіх налётаў на Германію ў ноч на 11 лістапада падвергла бамбардыроўцы ваенныя аб'екты Цэнтральнай Германіі.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 11 лістапада. (ТАСС). Газета «Нью-Йорк геральд трыбюн» паведамляе, што ў ноч на 11 лістапада германскія самалёты зрабілі адзін з самых інтэнсіўных налётаў на Лондан і многія іншыя раёны Англіі. Да паўночы бамбардыроўцы падвергласся звыш 12 раёнаў Лондана.

Лонданскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што ўвесь горад падвергся інтэнсіўнай бамбардыроўцы.

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што ў ноч на 11 лістапада германскія самалёты прадпрынялі вельмі інтэнсіўны налёт на Лондан. Не гледзячы на актыўныя дзеянні англійскіх зенітных гармат, германскія самалёты працягвалі бамбардыроўку Лондана каля 5 гадзін.

Бамбардыроўцы падвергліся ўсе раёны Англіі, у тым ліку і цэнтральныя.

Вайна паміж Грэцыяй і Італіяй

АФІНЫ, 11 лістапада. (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, апублікаванай увечары 10 лістапада, паведамляецца: «Авіяцыя праціўніка бамбардыравала некаторыя вёскі на востраве Крыт, не прычыніўшы ніякага матэрыяльнага ўрону.

На фронце Эпіра наша артылерыя паспяхова бамбардыравала скапленні праціўніка, які панёс вялікія страты. Захоплены розныя ваенныя матэрыялы.

У горных і лясістых раёнах Паўночнай часткі гор Пінд, паміж 28 кастрычніка і 10 лістапада адбываліся буйныя аперацыі, якія прывялі к поўнаму паражэнню і знішчэнню трэцяй альпійскай дывізіі італьянцаў. Гэта дывізія па працягу года знаходзілася ў Албаніі і была добра азнаёмлена з мясцовымі ўзгор'ямі».

АФІНЫ, 11 лістапада. (ТАСС). Як паведамляюць, сёння грэчаскія войскі прадпрынялі контратаку на рацэ Калемас. Ёсць забітыя і раненыя. Захоплены палонныя. Частка італьянскіх войск адступае.

Даныя аб прэзідэнцкіх выбарах у ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 10 лістапада. (ТАСС). Згодна апошняга паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, Рузвельт атрымаў 26.361 тысячу галасоў, а Уілкі—21.876 тысяч галасоў. Уілкі атрымаў большасць у штатах Каларада, Індыяна, Айова, Канзас, Мен, Мічыган, Небраска, Паўночная Дакота, Паўднёвая Дакота і Вермонт, маючых усяго 83 выбаршчыкі. Рузвельт атрымаў большасць у 38 штатах, маючых 449 выбаршчыкаў. Гэтыя даныя адносяцца к 120.620 выбарчым акругам з агульнай колькасці 127.345 выбарчых акруг. Па даных, усяго галасавала амаль 50 мільёнаў выбаршчыкаў супроць 45.600 тысяч у 1936 годзе. Падлік галасоў у астатніх нямногіх акругах, як указваюць, наўрад ці значна зменіць вышэйуказаныя вынікі.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, Рузвельт атрымаў большасць ва ўсіх важнейшых прамысловых штатах, а таксама буйных гарадах.

У палаце прадстаўнікоў дэмакраты атрымалі 267 месц, рэспубліканцы—162, прагрэсісты—3 месцы, фермарска-рабочая партыя — 1, амерыканская рабочая партыя — 1, незалежныя дэмакраты —1 месца. У сенаце дэмакраты маюць усяго 66 месц, рэспубліканцы — 28, незалежныя—1 і прагрэсісты —1 месца.

Праблема бежанцаў у Францыі

ВІШЫ, 10 лістапада. (ТАСС). На тэрыторыі неакупіраванай Францыі прадаўжае аставацца 350 тысяч бежанцаў з так званых забароненых зон (Па-дэ-Кале і іншыя дэпартаменты, на тэрыторыі якіх адбываюцца ваенныя аперацыі). На тэрыторыі акупіраванай зоны бежанцаў яшчэ больш. Лічаць, што больш мільёна чалавек да канца вайны будуць пазбаўлены магчымасці вярнуцца на радзіму. Многія сотні тысяч людзей наогул пазбавіліся прытулку, бо іх гарады і пасёлкі зусім разбураны ў час ваенных дзеянняў у паўночнай Францыі. Гэтыя бежанцы не маюць работы і сродкаў да існавання; халодныя лістападаўскія ночы яны праводзяць у хлявах на саломеных падсцілках. Мяркуюць, што кожнае паселішча з насельніцтвам у тысячу чалавек будзе абавязана ўзяць на сваё ўтрыманне 10 бежанцаў.

Моцнае землетрасенне ў Карпатах

НЬЮ-ЙОРК, 10 лістапада. (ТАСС). Як перадае бухарэсцкі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, румынская дзяржаўная абсерваторыя паведаміла, што сёння раніцой у Румыніі адчувалася два штуршкі з інтэрвалам у 5 секунд і працягласцю па 15 секунд кожны. Эпіцэнтр землетрасення знаходзіцца ў Бузау, у 20 мілях на паўночны ўсход ад Плоешці. Сейсмалагічныя інструменты ў абсерваторыі разбіты. Па афіцыяльных урадавых даных, піша карэспандэнт, у час землетрасення ў гарадах Бухарэсце, Галацы, Плоешці і Бузау забіта 200 чалавек. Тысяча чалавек ранена. Выратоўчыя работы затруднены ў сувязі з адсутнасцю святла. Многія раёны асталіся без электрычнасці, тэлефоннай і іншай сувязі з Бухарэстам. Чыгуначныя ўлады затрымліваюць адпраўленне паяздоў, чакаючы вынікаў абследвання чыгуначных шляхоў і мастоў. У Плоешці ўзніклі невялікія пажары. Да гэтага часу няма звестак аб уроне, прычыненым землетрасеннем нафтавым скважынам. У Бухарэсце і Бузау разбурана вялікая колькасць дамоў, многа дамоў пашкоджана, вуліцы поўны абломкаў. Усе бухарэсцкія ўрачы, аптэкары архітэктары і інжынеры мабілізаваны па загаду ваенных улад на выратоўчыя работы.

НЬЮ-ЙОРК, 10 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бухарэста, амаль кожная вуліца горада запоўнена асколкамі шкла і абломкамі будынкаў, пашкоджаных землетрасеннем. Землетрасеннем пашкоджана некалькі будынкаў, уключаючы будынак амерыканскай дыпламатычнай місіі, каралеўскі палац, будынак румынскага генеральнага штаба і іншыя.

Паводле паведамлення карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс з Бухарэста, прадстаўнікі ўлад заявілі, што ў Румыніі не было такога моцнага землетрасення з 1802 года.

* * *

САФІЯ, 10 лістапада. (ТАСС). Сёння, каля 3 гадзін 40 мінут раніцы, у Сафіі адчувалася моцнае землетрасенне, якое працягвалася некалькі мінут. Ваганні глебы былі настолькі моцнымі, што ў дамах разгойдваліся люстры, гойдалася мебля. Насельніцтва горада прачнулася. Многія жыхары аставілі дамы і выбеглі на вуліцы. Газеты «Утро» і «Заря» паведамляюць, што землетрасенне адчувалася таксама ў гарадах Русе, Варне, Бургасе, Плоўдзіве, Казанлыку і іншых. Паўсюды насельніцтва астаўляла дамы і выбягала на вуліцы. Звестак аб афярах і разбурэннях яшчэ няма. Вядома, што ў Русе цяжка ранен адзін чалавек і ёсць многа кантужаных. Паводле даных Цэнтральнага сейсмалагічнага інстытута, землетрасенне, эпіцэнтр якога знаходзіўся на адлегласці 350 кіламетраў у бок Румыніі, адчувалася па ўсёй краіне. У Сафіі землетрасенне было сілай у 5—6 балаў, у прыдунайскіх гарадах — у 7 балаў. Мяркуецца, што ў прыдунайскіх гарадах ёсць значныя разбурэнні.

* * *

КІШЫНЁЎ, 10 лістапада. Сёння паміж чатырма гадзінамі 35 мінутамі і 4 гадзінамі 41 мінутай раніцы ў Кішынёве адбылося землетрасенне. Штуршкамі вялікай сілы прычынены значныя разбурэнні жылым дамам і грамадскім будынкам. Соўнарком Малдавіі ўтварыў урадавую камісію дапамогі пацярпеўшым і ліквідацыі вынікаў землетрасення.

* * *

КІЕЎ, 10 лістапада. Сёння, у 4 гадзіны 42 мінуты раніцы, у Кіеве і іншых месцах Украіны адчуваліся моцныя падземныя штуршкі. Насельніцтва ў дамах прачнулася. У кватэрах чутны быў звон пасуды, трэск паркета, гойдаліся вісячыя прадметы — люстры, лямпы, дрыжэла шкло. Асабліва гэта адчувалася ў высокіх будынках.

У параўнанні з штуршкамі, якія адчуваліся 22 кастрычніка, сёння штуршкі былі значна мацней і працягваліся каля трох—чатырох мінут.

Аб падземных штуршках паведамляюць таксама з Акермана, Кіравагада, Палтавы, Вініцы і іншых месц.

* * *

ОДЭСА, 10 лістапада. Сёння, у 4 гадзіны 36 мінут раніцы, у Одэсе адчуваліся моцныя падземныя штуршкі. Вуліцы горада былі запружаны людзьмі, якія пакінулі свае жыллішчы. У некаторых дамах абваліліся сцены, балконы, карнізы. У капітальнай сцяне гасцініцы «Масква» утварылася трэшчына. Пашкоджаны столі і сцены гасцініцы «Пасаж» і іншых чатырох- і пяці-павярховых дамоў. На чыгуначнай станцыі Одэса-порт у час землетрасення вагоны рухаліся то ўзад, то ўперад.


Дырэктар геофізічнай абсерваторыі прафесар Тачайдлоўскі заявіў:

— Землетрасенне сілай у 7—8 балаў для Одэсы з'ява выключная. За апошнія 40 год не было зафіксіравана падземных штуршкоў такой сілы.

* * *

ДНЕПРАПЕТРОЎСК, 10 лістапада. Сёння, у 4 гадзіны 40 мінут раніцы, пачаліся падземныя штуршкі. Ва ўсіх дамах паявілася святло. Забегалі людзі. Сцены і падлогі варушыліся. Паявіліся трэшчыны на столях, абсыпалася штукатурка. Многія жыхары верхніх паверхаў выйшлі на вуліцу.

Нарастаючыя ваганні працягваліся больш 5 мінут. У розных частках Днепрапетроўска зарэгістрыраваны невялікія пашкоджанні будынкаў. У сярэдняй школе № 79 моцна патрэскаліся столі ў двух класах. Заняткі спынены да папраўлення пашкоджанняў. Вялікія трэшчыны і некаторыя разбурэнні ёсць у памяшканні Медыцынскага інстытута і ў іншых буйных дамах горада.



Калона войск беластоцкага гарнізона на тэатральнай плошчы перад пачаткам парада ў дзень 7 лістапада. Фота А. Сапіра.

Кастрычніцкія дні па нашай вобласці

ВАЎКАВЫСК. 7 лістапада стройнымі радамі прайшлі па гораду калоны дэманстрантаў. Красачна аформленыя пано адлюстроўвалі несакрушымую сілу нашай радзімы, росквіт і вялікую дружбу ўсіх народаў краіны сацыялізма. Чыгуначнікі Ваўкавыскага вузла прапеслі партрэты членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) і велізарнае пано на тэму: «СССР—вялікая чыгуначная дзяржава». Рабочыя мясакамбіната вышлі на дэманстрацыю з лозунгамі, праслаўляючымі веліч Сталінскай Канстытуцыі, пад сонцам якой свабодна і радасна зажылі народы заходніх абласцей Беларусі.

Калоны дэманстрантаў цагельнага завода, савецкіх устаноў і прамкааперацыі сваім афармленнем заклікалі працоўных актыўна ўдзельнічаць у надыходзячых выбарах, каб забяспечыць бліскучую перамогу сталінскага блока камуністаў і беспартыйных.

Асоавіяхім у сваіх лозунгах і плакатах паказаў сілу і магутнасць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота.

Над калонамі вучняў ваўкавыскіх школ узвышаўся мастацка-аформлены транспарант са словамі: «Дзякуй вялікаму Сталіну за шчаслівае дзяцінства». Усяго ў дэманстрацыі ўдзельнічала каля 13 тысяч чалавек.

7 і 8 лістапада на прадпрыемствах і ўстановах адбыліся вечары, дзе была паказана мастацкая самадзейнасць. У школах праведзены ранішнікі.

У дні свята ў Ваўкавыску адбылося адкрыццё помніка Леніну каля будынка горсовета.

* * *

БЕЛЬСК. Працоўныя раёна весела і радасна правялі свята — XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

6 лістапада ў будынку кінотэатра «Чырвоная зорка» адбыўся ўрачысты сход актыва, на якім прысутнічала каля 600 чалавек. Сход прывіталі піонеры Бельскай сярэдняй рускай школы. Прынята прывітальнае пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну.

У дэманстрацыі 7-га лістапада прыняла ўдзел звыш 2-х тысяч чалавек працоўных горада і калгаснікаў Бельскага раёна.

Урачыстыя сходы, прысвечаныя слаўнай гадавіне, адбыліся на прадпрыемствах, ва ўстановах і ў сельсаветах. Паўсюды працоўныя радасна славілі савецкі ўрад, камуністычную партыю і таварыша Сталіна за новае, шчаслівае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

* * *

ДАМБРОВА. У дзень свята горад прачнуўся рана. На вуліцах—незвычайнае ажыўленне. Групамі і ў паадзінку працоўныя спяшаліся да сваіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Затым да Цэнтральнай плошчы з розных бакоў сталі сцякацца калоны дэманстрантаў. Радасныя і вясёлыя, з лозунгамі і плакатамі дамброўцы запоўнілі плошчу. На свята ў горад прыбыла многа сялян з суседніх вёсак.

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР У ШОСТАЙ ШКОЛЕ

Добра правялі свята вучні 6-й яўрэйскай сярэдняй школы. Урачысты вечар, прысвечаны выдатнай гадавіне, адбыўся ў новаадрамантаваным зале. Гэты зал, а таксама піонерскі пакой вучні школы атрымалі як святочны падарунак.

Пасля даклада маёра тав. Грышына аб XXIII гадавіне Вялікага Кастрычніка пачалася багатая праграма мастацкай самадзейнасці: песні, пляскі і цікавы мантаж, ілюструючы вызваленне народаў заходніх абласцей Беларусі ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Мастацкая самадзейнасць 6-й школы абслужыла таксама ранішнікі рабочых 1-га тэкстыльнага камбіната і дзяцей работнікаў медсанпрацы.

З вялікім поспехам прайшоў спецыяльны святочны вечар для бацькоў вучняў. На ім прысутнічала звыш 200 чалавек.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

13 лістапада, у 8 гадзін вечара, у Доме партыйнай асветы (вул. Талстога, 9) будзе прачытана лекцыя на тэму: «Міжнароднае становішча». Лектар — тав. Антонаў.

Уваход па білетах. Білеты прадаюцца штодзённа ў бібліятэцы Дома партасветы з 10 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы.

Аддзел Прапаганды і Агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—92. Тыраж — 10.000 экз. Друкарня Беластокдрук